© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819–3625 №15(2), 2010

Міхаіл Нядзвецкі

# Узровень вэб-актыўнасці кандыдатаў на мясцовых выбарах 2010 года (Мінск)[1]

## Уводзіны

Гэтае даследаванне ёсць працягам папярэдняга вывучэння палітычнай вэб-актыўнасці ў Беларусі: падчас мясцовых выбараў 2007 г. (Крывалап, 2007: 56–63) і парламенцкіх 2008 г. (Храпавіцкі, 2008: 110–120). Вэб-актыўнасць падчас прэзідэнцкай кампаніі 2006 г. глыбока не вывучалася, а толькі згадвалася ў пералічаных вышэй, а таксама ў некаторых іншых працах (Мельянцоў, 2006: 32–41). Нізкую ступень даследаванасці вэб-актыўнасці выбарчых кампаніяў рознага ўзроўню можна патлумачыць дзвюма прычынамі. Па-першае, інтэнсіўны рост карыстальнікаў інтэрнэту ў Беларусі назіраецца толькі з 2009 г.: калі ў 2003 г. агульная колькасць беларускіх карыстальнікаў сусветнага павуціння складала 1.391.900 чалавек, у 2007 г. – 2.795.100 чалавек, то ў 2008 і 2009 гг. – 3.100.700 і 4.436.800 чалавек адпаведна (СтатКамитет, 2010b).

Паводле звестак Міжнароднага саюзу электрасувязі (International telecommunication union), у Беларусі налічвалася 6 млн інтэрнэт-карыстальнікаў з 9.690.000 чалавек насельніцтва краіны на той момант, то бок 61,92 % (Novostey.com, 2008). Пазней аказалася, што такія завышаныя лічбы былі выкліканыя выкарыстаннем некарэктнай інфармацыі Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь. Пасля выпраўлення недарэчнасці Саюз удакладніў ў статыстычныя звесткі, згодна з якімі ў 2007 г. у Беларусі было 2.809.800 інтэрнэт-карыстальнікаў ці 29% ад агульнай колькасці жыхароў краіны. Рэсурс CIA (The World Factbook, 2008) ацэньваў колькасць беларускіх інтэрнэт-карыстальнікаў як 3.100.700 чалавек (57-ае месца ў свеце). На пачатку 2009 г. беларускую аўдыторыю ацэньвалі, паводле інфармацыі «Акавіты», у раёне 3 млн чалавек, у сакавіку 2009 г. – 3,2 млн. Адно з грамадскіх апытанняў (НИСЭПИ, 2009), праведзенае нап-

[1] Даследаванне праводзілася ў межах праекту падтрымкі навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту (Вільня, Літва) у перыяд з 1 ліпеня да 15 лістапада 2010 г.

рыканцы 2009 г., паказала, што інтэрнэтам карыстаецца 41,4% беларусаў.

Другою прычынай ёсць павольнае развіццё самога сеціва, выкліканае дзеяннем манаполіі з боку РУП «Белтэлекам» на рынку аказання паслугаў – праз кантроль усяго трафіку і яго размеркавання іншымі правайдэрамі, а таксама праз палітыку цэнаў. На практыцы гэта значыла, што пры малых хуткасцях кошты на інтэрнэт былі вялікімі. Палітыка цэнаў, а таксама аб'ём вонкавага каналу пачынаюць змяняцца ў 2009 г.: напрыклад, калі ў 2005 г. шырыня айчыннага інтэрнэт-шлюзу складала 465 Мбіт/с, у 2006-м – 1,8 Гбіт/с, у 2007-м – 3,1 Гбіт/с, у 2008-м – 5,2 Гбіт/с, то ўжо ў 2009 г. вонкавы канал складаў 22 Гбіт/с, а ў другой палове 2010 г. – 47 Гбіт/с (It.tut.by, 2010).

## I. Кароткая характарыстыка кампаніі мясцовых выбараў 2010 года

Выбары ў Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў прайшлі 25 красавіка 2010 г. Датэрміновае галасаванне праходзіла ў перыяд 20–24 красавіка. Тэрыторыя дзевяці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак сталіцы (раёнаў) была падзеленая на 57 выбарчых акругаў: Заводскі раён на сем акругаў; Ленінскі – сем; Кастрычніцкі – шэсць; Маскоўскі – восем; Партызанскі – тры; Першамайскі – сем; Савецкі – пяць; Фрунзенскі – дзесяць; Цэнтральны – чатыры.

Паводле стану на 1 красавіка 2010 г. у якасці кандыдатаў у дэпутаты зарэгістравалі 221 асобу (Минский курьер, 2010). Такім чынам, конкурс склаў 3,88 чалавекі на адно дэпутацкае месца. Мінімальная колькасць кандыдатаў на акрузе складала два чалавекі, максімальная – сем (Сухараўская выбарчая акруга № 30). Сярэдняя колькасць кандыдатаў па акрузе ў Заводскім раёне склала 3,43 чалавекі; у Ленінскім – 4; Кастрычніцкім – 4,5; Маскоўскім – 2,63; Партызанскім – 5; Першамайскім – 3,86; Савецкім – 4; Фрунзенскім – 4,2; Цэнтральным – 4,75.

Пры аналізе колькасных паказнікаў выявілася адна тэндэнцыя: у акругах з двума кандыдатамі (такіх было шэсць: па адной у Ленінскім і Фрунзенскім раёнах і ажно чатыры ў Маскоўскім) у трох выпадках (выбарчыя акругі №13, 23 і 37) «барацьба» адбывалася паміж беспартыйнымі прадстаўнікамі дырэктарату дзяржаўных установаў з сябрамі Ліберальна-дэмакратычнай партыі; на выбарчай акрузе № 24 канкуравалі галоўны эканаміст аднаго з аддзелаў «Белаграпрамбанку» і першы сакратар БРСМ Маскоўскага раёну (абодва беспартыйныя); на акрузе № 27 – зноў беспартыйныя (галоўны лекар і працаўнік прыватнага прадпрыемства ва ўзросце дваццаці аднаго года). Толькі ў адным выпадку – на акрузе № 26 – канкурэнцыю дырэктару гандлёвага цэнтру склаў прадстаўнік апазіцыйнай Беларускай партыі левых «Справядлівы свет».

На думку аўтара, практыка выстаўлення спарынг-кандыдатаў з ліку

прапрэзідэнцкай Ліберальна-дэмакратычнай партыі ці асобаў з незразумелай арганізацыйнай прывязанасцю ажыццяўлялася для імітацыі электаральнай барацьбы. Па-першае, у выбарцаў з'яўлялася пэўная «альтэрнатыва» кандыдату ад улады; па-другое, вынікі выбараў у такіх акругах цалкам легалізоўваліся (адсутнасць апазіцыйных кандыдатаў сама па сабе ліквідавала магчымасць любой крытыкі, бо тыя, хто зазнаў паразу, у сваю чаргу не аспрэчвалі вынікаў).

У цэлым выбары прайшлі з мноствам парушэнняў, таму АБСЕ і беларускія незалежныя назіральнікі не прызналі іх свабоднымі і дэмакратычнымі.

## II. Метадалогія даследавання

Мэтаю даследавання ёсць выяўленне ўзроўню вэб-актыўнасці падчас мясцовых выбараў 2010 г. у Мінску. Асноўнаю задачаю даследавання ёсць атрыманне звестак пра вэб-актыўнасць кандыдатаў у дэпутаты і правядзенне яе колькаснага аналізу. У будучыні даследаванне можа супастаўляцца з іншымі даследаваннямі вэб-актыўнасці ў Беларусі дзеля агульнай ацэнкі лангіцюдных змяненняў шэрагу палітычных кампаніяў і дзеля фіксацыі эвалюцыі або стагнацыі вэб-актыўнасці ў Беларусі.

Даследаванне імкнецца разгледзець асаблівы аспект праблемы: у якой ступені інтэрнэт у Беларусі ёсць прыкладным інструментам у палітычных кампаніях. Для аналізу вэб-актыўнасці падчас мясцовых выбараў 2010 г. мы будзем разглядаць дзве асноўныя функцыі: 1) інфармацыйную падтрымку кандыдатаў у дэпутаты ды 2) рэкрутаванне валанцёраў і мабілізацыю чалавечых рэсурсаў для правядзення ўласнай кампаніі. Метадалогія праекту заснаваная на статыстычным аналізе ўсіх зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты па Мінску паводле стану на 1 красавіка 2010 г.[2]

У якасці адзінкі даследавання выступае наяўнасць вэб-старонак у сацыяльных сетках *odnoklassniki.ru, vkontakte.ru, facebook.com;* блогаў на рэсурсах *livejournal.com, twitter.com* ды іншых падобных сістэмах; а таксама наяўнасць персанальных сайтаў. Пошук сайтаў і блогаў (уключаючы мікраблогавую сістэму *twitter.com*) ажыццяўляўся праз сайт *google.com*; акаўнтаў у сацыяльных сетках і для сайту *livejournal.com* – праз уласныя пошукавыя сістэмы гэтых рэсурсаў. Для персанальных сайтаў, блогаў, старонак у «LiveJournal» і «Twitter», старонак кандыдатаў ды інфармацыйных суполак у сацыяльных сетках праводзіўся кантэнт-аналіз. Для кадавання інфармацыі збіраліся наступныя звесткі: прозвішча ды імя; узрост (паводле стану на 25 красавіка 2010 г.); акруга, дзе балатаваўся кандыдат; партыйная прыналежнасць і

[2] Кандыдаты, якія здымаліся з выбарчай дыстанцыі з любых прычынаў пазней за 1 красавіка 2010 г., усё роўна ўлічваліся пры правядзенні даследавання.

сяброўства ў грамадскіх арганізацыях.

Даследуючы вэб-актыўнасць кампаніі лакальнага ўзроўню, аўтар робіць некалькі дапушчэнняў: па-першае, сабраныя звесткі не даюць абсалютна справядлівага адлюстравання ўзроўню вэб-актыўнасці. У прыватнасці, у сацыяльных сетках існуе практыка закрытых профіляў, што не дае магчымасці сабраць патрэбную інфармацыю. Па-другое, без дадатковых метадаў (анкетавання, інтэрв'ю ды інш.) у сацыяльных сетках можна прааналізаваць толькі адкрытую інфармацыю («open information») – статусы, запісы на сцяне, спасылкі на іншыя вэб-крыніцы, фотаздымкі і відэазапісы, інфармацыю ў тэматычных суполках. Камунікацыя кандыдата з патэнцыйнымі выбарцамі (вядома, пры яе наяўнасці) праз паведамленні, чаты, рассылку электроннай пошты ёсць закрытай інфармацыяй («closed information»). Што датычыць гэтага даследавання, то пры яго правядзенні да дадатковых метадаў не звярталіся, а інфармацыя бралася толькі з адкрытага доступу.[3] Пры аналізе сацыяльных сетак і сістэмы «Twitter» у бальшыні выпадкаў немагчыма было высветліць дакладную дату рэгістрацыі акаўнтаў, таму не выключаецца магчымасць таго, што некаторыя акаўнты ўвогуле былі зарэгістраваныя пасля правядзення выбараў.

## III. Вынікі даследавання

***Odnoklasniki.ru.*** Сайт *odnoklassniki.ru* з'явіўся 4 сакавіка 2006 г. і на сённяшні дзень ёсць адным з самых папулярных рэсурсаў расійскамоўнага інтэрнэту. Беларуская аўдыторыя гэтай сацыяльнай сеткі на пачатку 2009 г. складала больш за 800.000 чалавек (Marketing.by, 2010). Згодна з версіяй *alexa.com*, рэсурс *odnoklassniki.ru* займае паводле папулярнасці 12-е месца ў Беларусі (Alexa.com, 2010).

Пошук кандыдатаў праводзіўся праз увядзенне прозвішча ды імя кандыдата (на расійскай мове)[4] і ўзросту (паводле стану на 25 красавіка 2010 г.). З агульнай колькасці зарэгістраваных па Мінску кандыдатаў у дэпутаты ў сацыяльнай сетцы *odnoklassniki.ru* былі знойдзеныя 70 чалавек. Адсотак знойдзеных акаўнтаў ад агульнай колькасці зарэгістраваных дэпутатаў – 31,67%. У 16-ці акаўнтах можна было прасачыць вэб-актыўнасць падчас выбарчай кампаніі (ці 22,86% ад колькасці знойдзеных акаўнтаў кандыдатаў). У

[3] Вывучаючы вэб-актыўнасць кандыдатаў у дэпутаты, аўтар кіраваўся наступным прынцыпам: збор інфармацыі ў сацыяльных сетках і блогавых сістэмах праводзіўся не з уласных, а са спецыяльна зарэгістраваных акаўнтаў. Такі крок стаў своеасаблівым эксперыментам, пры якім аўтар даследавання выступаў у ролі патэнцыйнага выбарца кандыдата. Аўтар мяркуе, што кандыдат мусіў рабіць свае акаўнты ў сацыяльных сетках адкрытымі, каб пашырыць магчымасць прагляду інфармацыі. Акрамя таго, павышалася імавернасць правядзення аб'ектыўнага даследавання, бо з шэрагам кандыдатаў у дэпутаты аўтар знаёмы асабіста.

[4] Згодна з правапісам імя і прозвішча кандыдатаў у дэпутаты, апублікаваных на сайце Мінгарвыканкаму: http://minsk.gov.by/ru/actual/view/240/sveden_dept.shtml.

адзіным выпадку[5] было немагчыма атрымаць інфармацыю, неабходную для правядзення даследавання. Яшчэ ў адным выпадку[6] немагчыма было даць гарантыю, што быў знойдзены патрэбны чалавек, таму ён не ўключаўся ў агульную колькасць знойдзеных акаўнтаў. У табл. 9 (гл. Дадатак) змешчаная агульная інфармацыя з кантэнт-аналізам акаўнтаў кандыдатаў на рэсурсе *odnoklassniki.ru*.

Кантэнт-аналіз тых акаўнтаў, дзе была заўважаная пэўная вэб-актыўнасць, паказаў, што кандыдаты пераважна[7] выкарыстоўвалі на рэсурсе статусы – агульную інфармацыю, якая датычыць кампаніі, ці спасылкі на іншыя свае вэб-рэсурсы. У выпадку з кандыдатам Вольгай Касаткінай (Лошыцкая выбарчая акруга № 14) назіраецца сітуацыя, калі статус з'явіўся толькі пасля выбараў ды інфармаваў пра перамогу, аднак больш ніякай актыўнасці заўважана не было. У выпадку з Барысам Самковічам (Купалаўская акруга № 12) назіраецца сітуацыя, калі статусы выкананы ў нахабным стылі. Другою паводле папулярнасці формай актыўнасці было выстаўленне інфармацыі з

**Табліца 1. Формы вэб-актыўнасці кандыдатаў у дэпутаты на сайце *odnoklassniki.ru***

| Форма вэб-актыўнасці | Колькасць |
|---|---|
| Біяграфічныя звесткі кандыдата | 7 |
| Запісы на сцяне акаўнту | 1 |
| Статусы і спасылкі на іншыя вэб-рэсурсы | 12 |
| Фотаздымкі | 4 |

**Табліца 2. Узроставая структура кандыдатаў у дэпутатаў, якія маюць рэгістрацыю на сайце *odnoklassniki.ru***

| Узрост | Колькасць кандыдатаў | Колькасць, % |
|---|---|---|
| 18–21 | 1 | 1,43 |
| 22–25 | 13 | 18,57 |
| 26–30 | 24 | 34,29 |
| 31–40 | 15 | 21,43 |
| 41–50 | 11 | 15,71 |
| >50 | 6 | 8,57 |

[5] Закрыты профіль кандыдата ў дэпутаты Юрыя Васкрасенскага (Машэраўская выбарчая акруга № 47).

[6] Профіль кандыдата ў дэпутаты Зайтуны Івановай (Ангарская выбарчая акруга № 2). Блытаніна ўзнікла з той прычыны, што праз пошукавую сістэму сайту быў знойдзены чалавек з супадзеннем імя, прозвішча і ўзросту, але горад (не вядома, нараджэння ці цяперашняга пражывання) гэтага чалавека знаходзіцца на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

[7] Кандыдат у дэпутаты мог у сваім акаўнце выкарыстоўваць адразу ўсе формы вэб-актыўнасці або толькі адну з формаў.

біяграфічнымі звесткамі кандыдатаў і, у меншай ступені, фотаздымкаў і запісаў на сценах акаўнтаў.

Сярэдні ўзрост кандыдатаў, якія маюць рэгістрацыю ў гэтай сацыяльнай сетцы, склаў 33,23 года, пры гэтым мінімальны ўзрост кандыдатаў склаў 21 год, а максімальны – 59. У табл. 2 паказваецца ўзроставая структура кандыдатаў, што маюць рэгістрацыю на рэсурсе *odnoklassniki.ru*. Як бачым, траціна ўваходзіць ва ўзроставую групу ад 26 да 30 гадоў, але немалую долю складаюць і групы старэйшых за 31 год – агулам 45,71%.

Калі аналізаваць вэб-актыўнасць на сайце *odnoklassniki.ru*, то сярод праўладных кандыдатаў яе можна прасачыць толькі ў чатырох асобаў: Вадзіма Кудзіна (Вяснянская акруга № 39), Эдуарда Кузняцова (Мірашнічэнкаўская акруга № 43), Аляксея Музыкіна (Васняцоўская акруга № 5) і Андрэя Чыстага (Лагойская акруга № 44).

Сярод апазіцыйных кандыдатаў толькі сярод чатырох было заўважанае вядзенне актыўнасці: у Аляксандра Куўшынава (Машэраўская акруга №47), Юрыя Меляшкевіча (Слабадская акруга № 28), Аляксандра Шумкевіча (Вяснянская акруга № 39) і Дзмітрыя Ясевіча (Шабаноўская акруга № 3; пасля зняў сваю кандыдатуру).

Сярод кандыдатаў без вызначанай арганізацыйнай прывязанасці вэб-актыўнасць на сайце заўважаная ў Эдуарда Амельчука (Сухараўская акруга № 30), Алены Бандарэнкі (Лошыцкая акруга № 14), Таццяны Бурай (Мендзялееўская акруга № 55), Таццяны Куўшынавай (Машэраўская акруга № 47), Ірыны Пташнік (Заходняя акруга № 29), Барыса Самковіча і Сяргея Федарца (Пляханаўская акруга № 10), а таксама ў Дзмітрыя Шаўцова (Куйбышаўская акруга № 46).

***Vkontakte.ru (vk.com).*** Сайт *vkontakte.ru* (міжнародная версія *vk.com*) з'явіўся 10 кастрычніка 2006 г. і на сённяшні дзень ёсць самым папулярным рэсурсам у Расіі ды Украіне, а таксама другім паводле папулярнасці ў Беларусі (Alexa.com, 2010). Беларуская аўдыторыя рэсурсу ў сакавіку 2010 г. перавышала 1.725.000 чалавек (Rgmedia.by, 2010).

Пошук кандыдатаў праводзіўся праз увядзенне прозвішча ды імя кандыдата (на расійскай і беларускай мовах) і ўзросту (паводле стану на 25 красавіка 2010 г.). Пры правядзенні пошуку было знойдзена 47 акаўнтаў кандыдатаў у дэпутаты, якія карыстаюцца гэтым рэсурсам, што склала 21,27% ад агульнай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў. У васьмі выпадках была заўважаная вэб-актыўнасць, што склала 17,02 % ад агульнае колькасці знойдзеных акаўнтаў кандыдатаў. У дзесяці выпадках немагчыма было знайсці інфармацыю, неабходную для правядзення даследавання. У табл. 3 адлюстроўваецца агульная інфармацыя наконт формаў вэб-актыўнасці.

Бачна, што статусы, запісы на сцяне акаўнту, размяшчэнне фотаздымкаў (саміх кандыдатаў або выбарчай прадукцыі) у аднолькавай колькасці ўжываліся ў якасці формаў вэб-актыўнасці на сайце *vkontakte.ru*. Трое кандыдатаў – Таццяна Куўшынава, Фёдар Масленнікаў (Чыгуначная

**Табліца 3. Формы вэб-актыўнасці кандыдатаў у дэпутаты на сайце *vkontakte.ru***

| Форма вэб-актыўнасці | Колькасць |
|---|---|
| Запісы на сцяне акаўнту | 3 |
| Статусы і спасылкі на іншыя вэб-рэсурсы | 3 |
| Суполкі кандыдатаў у дэпутаты | 3 |
| Фотаздымкі | 3 |

акруга № 20) і Аляксандр Шумкевіч – мелі ўласныя інфармацыйныя суполкі. Сярэдні ўзрост кандыдатаў, зарэгістраваных на сайце, – 26,57 года, пры гэтым мінімальны ўзрост кандыдатаў склаў 18 гадоў, а максімальны – 42. У табл. 4 паказаная ўзроставая структура ўсіх кандыдатаў, якія маюць рэгістрацыю на сайце. Асноўная ўзроставая група кандыдатаў на *vkontakte.ru* (*vk.com*) – ад 22 да 25 гадоў. За ёй ідзе група ва ўзросце 26–30 гадоў. Агулам кандыдатаў ва ўзросце да 30 гадоў налічваецца 77,85%.

Сярод праўладных кандыдатаў вэб-актыўнасць можна назіраць толькі ў аднаго – прадстаўніка Ліберальна-дэмакратычнай партыі Эдуарда Кузняцова. Сярод апазіцыйных кандыдатаў вэб-актыўнасць назіраецца ў пяці чалавек: Аляксандра Лагвінца (Сухараўская акруга № 30), Віталя Карабкова (Ракасоўская акруга № 9), Фёдара Масленнікава, Аляксандра Сяргеенкі (Ангарская акруга № 2) і Аляксандра Шумкевіча. Сярод кандыдатаў без вызначанай арганізацыйнай прывязанасці вэб-актыўнасць назіралася толькі ў Таццяны Куўшынавай і Арцёма Шаркова (Сухараўская акруга № 30).

Таццяна Куўшынава, Фёдар Масленнікаў і Аляксандр Шумкевіч мелі асобныя інфармацыйныя суполкі. Так, у суполку Куўшынавай паводле стану на 9 лістапада 2010 г. уваходзілі ўсяго дзевяць удзельнікаў, хоць суполка і мела адкрыты доступ для кожнага, хто мае рэгістрацыю на сайце *vkontakte.ru*. Яна змяшчала агульную інфармацыю пра кандыдата, спасылку на асноўны сайт, сямнаццаць фотаздымкаў (з іх тры – спам) і адзін відэазапіс. З усёй статыстыкі можна зрабіць выснову, што гэтая суполка мала выкарыстоўвалася для інфармацыйнае падтрымкі кампаніі кандыдата ў дэпутаты.

**Табліца 4. Узроставая структура кандыдатаў у дэпутаты, якія маюць акаўнты на сайце *vkontakte.ru***

| Узрост | Колькасць кандыдатаў | Колькасць, % |
|---|---|---|
| 18–21 | 8 | 17,02 |
| 22–25 | 18 | 38,3 |
| 26–30 | 12 | 25,53 |
| 31–40 | 8 | 17,02 |
| 41–50 | 1 | 2,13 |
| >50 | - | - |

Суполка Ф. Масленнікава паводле стану на 9 лістапада 2010 г. налічвала 31 ўдзельніка. Яна змяшчае агульную інфармацыю пра кандыдата, размеркаваную па наступных блоках: «*Пра кандыдата Масленнікава Фёдара*», «*Праграма – толькі факты*», «*Хто можа галасаваць?*», «*Маладыя дэмакраты – каманда дэпутатаў*». Адзначым, што суполка мае добрае інфармацыйнае напаўненне: там можна даведацца пра асноўны мэсідж кандыдата патэнцыйным выбарцам, прыводзяцца праграмныя тэзісы, інфармацыя пра межы акругі ды пра каманду кандыдатаў у дэпутаты па Мінску ад моладзевай арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі «Маладыя дэмакраты».

У суполцы прысутнічае зваротная сувязь: пераважна ў запісах на сцяне суполкі, а таксама адзін запіс у рубрыцы «*Сустрэчы з выбарцамі*». Ёсць таксама чатыры спасылкі на інфармацыйныя суполкі: Аб'яднанай грамадзянскай партыі, арганізацыі «Маладыя дэмакраты», грамадзянскай кампаніі «За альтэрнатыўную службу ў Беларусі» ды культурніцкага аддзелу АГП.

Трэцяя інфармацыйная суполка – кандыдата ад Моладзевага хрысціянскага сацыяльнага саюзу «Маладыя дэмакраты» (не блытаць з арганізацыяй АГП «Маладыя дэмакраты») Аляксандра Шумкевіча – на 9 лістапада 2010 г. мела 19 удзельнікаў. Суполка слаба напоўненая інфармацыяй: фотаальбом змяшчае дванаццаць здымкаў, восем з якіх – спам. Фідбэк утрымлівае ўзаемныя абразы двух бакоў: кандыдата і чальцоў суполкі, таму ствараецца падазрэнне, што сама суполка, як і акаўнт Шумкевіча (усяго на сайце *vkontakte.ru* было знойдзена сем профіляў кандыдата ў дэпутаты), не ёсць сапраўднаю.

***Facebook.com.*** У агульным рэйтынгу (*Alexa.com*, 2010) сацыяльная сетка *facebook.com* займае 14-е месца. Беларуская аўдыторыя гэтага рэсурсу на пачатку кастрычніка 2010г. складала 119.800 карыстальнікаў (Facebackers.com, 2010). З агульнай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў на сайце *facebook.com* было знойдзена 28 акаўнтаў (12,66 %). Колькасць акаўнтаў, на якіх падчас выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы кампаніі была заўважаная вэб-актыўнасць – шэсць (ці 21,43% ад колькасці знойдзеных акаўнтаў кандыдатаў). Сярэдні ўзрост кандыдатаў, які маюць рэгістрацыю на *facebook.com* (28 чалавек), склаў 30,29 годоў: мінімальны ўзрост – 18 гадоў, максімальны – 58.

**Табліца 5. Узроставая структура кандыдатаў у дэпутаты, якія маюць акаўнты на сайце *facebook.com***

| Узрост | Колькасць кандыдатаў | Доля, % |
|---|---|---|
| 18–21 | 2 | 7,14 |
| 22–25 | 9 | 32,14 |
| 26–30 | 7 | 25 |
| 31–40 | 6 | 21,43 |
| 41–50 | 2 | 7,14 |
| >50 | 2 | 7,14 |

Папулярнаю формаю вэб-актыўнасці на сайце *facebook.com* былі запісы на сцяне акаўнтаў; у крыху меншай ступені – статусы, спасылкі на іншыя вэб-рэсурсы і фотаздымкі. Сярод праўладных кандыдатаў ніводзін не выкарыстоўваў «Facebook» для вэб-актыўнасці. Пры гэтым на рэсурсе назіраецца вялікая колькасць кандыдатаў ад апазіцыі – агулам 20 чалавек. Чатыры з іх – Вадзім Канапацкі (Першамайская акруга № 56), Аляксандр Лагвінец, Уладзімір Навасяд (Пляханаўская акруга № 10) і Аляксандра-Вольга Тыгрыцкая (Першамайская акруга № 56) – выкарыстоўвалі сайт у якасці крыніцы інфармацыйнае падтрымкі (Лагвінец – яшчэ і для мабілізацыі чалавечых рэсурсаў). Сярод кандыдатаў без арганізацыйнай прывязанасці вэб-актыўнасць была заўважаная толькі ў Таццяны Куўшынавай і Арцёма Шаркова.

**Табліца 6. Формы вэб-актыўнасці кандыдатаў у дэпутаты на сайце *facebook.com***

| Форма вэб-актыўнасці | Колькасць |
|---|---|
| Арганізацыя падзеяў і рассылка запрашэнняў | 1 |
| Відэа | 1 |
| Запісы на сцяне | 5 |
| Зваротная сувязь | 2 |
| Інфармацыйная суполка | 1 |
| Спасылкі, статусы | 3 |
| Фотаздымкі | 3 |

Адзін кандыдат – Аляксандр Лагвінец – меў уласную інфармацыйную суполку, у якой паводле стану на 9 лістапада 2010 г. было 111 чальцоў. Суполка мае добры інфармацыйны кантэнт: навіны ўласнай выбарчай кампаніі, спасылкі на артыкулы ў медыях, фотаздымкі. Бачная прысутнасць зваротнай сувязі. Адзінаю заўвагаю ёсць разыходжанне колькасці сяброў кандыдата ва ўласным профілі з колькасцю ўдзельнікаў у суполцы.

***Twitter.com***. Мікраблогавая сістэма «Twitter» – найноўшы вэб-сэрвіс, які пачаў набываць папулярнасць у Беларусі, у адрозненне, напрыклад, ад такіх сэрвісаў як міжнародны *jaiku.com*, расійскі *juick.com* ці айчынны *speech.by*. Але даследаванне паказала, што рост папулярнасці сістэмы «Twitter» не адбіўся на вэб-актыўнасці кандыдатаў у дэпутаты на мясцовых выбарах 2010 г.

Метадалогія пошуку заставалася такою самаю, як і ў выпадках з сацыяльнымі сеткамі *odnoklassniki.ru*, *facebook.com* і *vkontakte.ru*: уводзіліся імя, прозвішча і горад пражывання (узрост не ўводзіўся). Пошук кандыдатаў апынуўся самым цяжкім этапам: па-першае, сістэма дае колькасны ліміт на знаходжанне людзей цягам 24 гадзінаў; па-другое, у сістэме не прадугледжваецца транслітарацыя імя і прозвішча. Пошук адбываўся з увядзеннем беларуска- і

расійскамоўнага напісання імя і прозвішча, а таксама ўводзіліся камбінацыі напісання лацінкаю паводле правілаў транслітарацыі.[8] Дадаткова адбываўся пошук кандыдатаў праз пошукавую сістэму *google.com*, бо яна індэксуе запісы ў «Twitter».

У выніку было знойдзена дзевяць акаўнтаў кандыдатаў, якія маюць рэгістрацыю на гэтым сайце: Валянціна Вячоркі (Мірашнічэнкаўская акруга №43), Вячаслава Дзіянава (Шугаеўская акруга №53), Ірыны Губскай (Шугаеўская акруга № 53), Таццяны Куўшынавай, Аляксандра Лагвінца, Фёдара Масленнікава, Юрыя Фабішэўскага (Курасоўшчынская акруга № 16), Артура Фінькевіча (Убарэвіцкая акруга № 7) і Аляксея Янукевіча (Галадзедаўская акруга № 6).

З усіх знойдзеных акаўнтаў вэб-актыўнасць на рэсурсе заўважаная толькі ў двух кандыдатаў: Аляксандра Лагвінца і Фёдара Масленнікава. Першы выкарыстоўваў гэты сродак для інфармацыйнага асвятлення выбарчай кампаніі, другі – яшчэ і ў якасці спосабу рэкрутацыі валанцёраў.

Акаўнт Лагвінца меў шэсць запісаў (tweets), прысвечаным мясцовым выбарам: сярод іх пяць запісаў зробленыя па-беларуску, адзін – на англійскай мове. Паводле стану на 9 лістапада 2010 г. акаўнт меў 263 падпісчыкі, а сам быў падпісаны на 227 акаўнтаў. Гэтыя паказнікі ўяўляюць з сябе добрыя суадносіны паміж тымі, хто чытае блог Лагвінца, будучы зарэгістраванымі ў сістэме мікраблогаў, і тымі, каго чытае сам уладальнік акаўнту. Акаўнт адкрыты, што тэарэтычна значна павышае яго чытанасць сярод тых, хто не мае рэгістрацыі ў гэтай сістэме.

У Масленнікава выбарам прысвечаныя шэсць інфармацыйных запісаў і яшчэ адзін утрымлівае прапанову ўвайсці ў каманду кандыдата. Паводле стану на 9 лістапада 2010 г. акаўнт кандыдата меў 184 падпісчыкі, а сам кандыдат падпісаны на 114 акаўнтаў. У профілі ўтрымліваецца спасылка на афіцыйны сайт арганізацыі «Маладыя дэмакраты», у якую ўваходзіць кандыдат. Акаўнт таксама адкрыты.

У астатніх знойдзеных акаўнтах не было заўважана якіх-небудзь відаў актыўнасці, звязаных з правядзеннем кампаніі ў мясцовыя саветы. Пры гэтым некаторыя акаўнты – кандыдатаў Вячоркі, Дзіянава, Фінькевіча і Янукевіча – маюць першыя запісы ўжо пасля правядзення выбараў; а ў выпадку з кандыдатамі Губскай, Куўшынавай і Фабішэўскім проста не выкарыстоўваліся.

У «Twitter» існуе практыка стварэння гэш-тэгаў (hash-tag), якія дазваляюць рабіць запісы ў суполку на асобныя тэмы. Так, перад выбарамі быў адмыслова зроблены тэг *#electby*. Кандыдаты, чые профілі былі знойдзеныя ў «Twitter», не выкарыстоўвалі гэтага тэгу для ўласнай папулярызацыі, інфармацыйнай кампаніі або мабілізацыі чалавечых рэсурсаў – яго пераважна выкарыстоўвалі назіральнікі падчас выбараў.

***Персанальныя сайты і блогі.*** Месячная аўдыторыя белару-

[8] Праз анлайнавы лацінізатар: http://www.pravapis.org/latin.asp

скага сегменту блогавай сістэмы *livejournal.com* складае больш за 270.000 чалавек (*Alexa.com*, 2010), а сам сайт паводле рэйтынгу займае 13-е месца (*Alexa.com*, 2010).

Пры пошуку было знойдзена 13 блогаў кандыдатаў (Кудзіна, Радкевіча, Шылава, Губскай, Корбана, Лагвінца, Масленнікава, Навасяда, Пташнік, Меляшкевіча, Янчурэвіча, Кузняцова і Куўшынавай) і 5 сайтаў (Куўшынавай, Лагвінца, Амельчука, Шаркова і Язава). Акрамя гэтага, у сістэме «LiveJournal» быў знойдзены фан-клуб Т. Куўшынавай.

Правядзенне кантэнт-аналізу блогаў паказала, што найбольш эфектыўна праца рабілася на старонках кандыдатаў Куўшынавай, Радкевіча, Лагвінца і Пташнік. Пры гэтым, блог Ірыны Пташнік адмыслова быў адкрыты для кампаніі ў мясцовыя саветы, пра што ўскосна сведчыць сама назва інтэрнэт-дзённіку.

Пэўную спробу арганізацыі перадвыбарчага блогу рабілі кандыдаты Губская, Меляшкевіч і Навасяд; але вядзенне старонак не было надта прадуктыўнае.

Кандыдаты Кудзін, Шылаў, Корбан, Масленнікаў, Янчурэвіч і Кузняцоў зрабілі слабую спробу арганізаваць працу ў блогавых сістэмах, маючы пры гэтым рэгістрацыю, або ўвогуле праігнаравалі такі від дзейнасці.

Што датычыць блогу фан-клубу Таццяны Куўшынавай, то ён мае вельмі малую інфармацыю напаўняльнасць (усяго тры запісы) і малую колькасць сяброў.

Кантэнт-аналіз сайтаў паказаў, што найбольш эфектыўнымі былі рэсурсы кандыдатаў Куўшынавай і Лагвінца. Персанальны сайт Куўшынавай, дзякуючы добрай раскрутцы, стаў сапраўды пазнавальным і наведвальным. Такая паспяховасць найперш абумоўліваецца тым, што сайт мае добры кантэнт. Акрамя інфармацыйнай часткі, сайт выступае як сродак мабілізацыі рэсурсаў для кампаніі ды ўтрымлівае пэўныя прапановы, якім чынам старонні чалавек можа дапамагчы кандыдату.

На сайце Лагвінца ў перыяд з 18 лютага да 30 красавіка 2010 г. налічваецца 20 артыкулаў, якія датычаць кампаніі кандыдата, вялікая частка артыкулаў дапоўненая фотаздымкамі, некаторыя – відэазапісамі.

Сайты астатніх трох кандыдатаў маюць слабыя якасныя паказнікі эфектыўнасці: кепская тэхнічная арганізацыя; малы аб'ём інфармацыі (у выпадку з А. Шарковым – яшчэ і наяўнасць граматычных памылак).

***Іншыя віды вэб-актыўнасці.*** Да іншых відаў вэб-актыўнасці можна аднесці выкарыстанне рассылкі праз электронную пошту; відэа- і банэрную рэкламу. Каб усталяваць факты выкарыстання электроннай рассылкі падчас выбарчай кампаніі кандыдатаў, трэба ўжываць дадатковыя метады: анкетаванне ці інтэрв'ю кандыдатаў і/або выбарцаў. У межах гэтага даследавання да дадатковых метадаў не звярталіся, але дакладна вядома, што прынамсі для мабілізацыі чалавечых рэсурсаў (пошук валанцёраў) і для інфармацыйнай кампаніі такі метад актыўнасці ў інтэрнэце выкарыстоўваў кандыдат Аляксандр Лагвінец.

База адрасоў электроннай пошты магла фармавацца ў працэсе збору подпісаў. Акрамя гэтага кандыдаты маглі выкарыстоўваць кантакты з уласнай базы.

Выкарыстанне банэрнай рэкламы было заўважанае толькі ў адным выпадку – у Таццяны Куўшынавай. Банэр рэкламаваў персанальны сайт кандыдата і быў дапоўнены слоганам выбарчай кампаніі: *«Прыгажосць выратуе свет»*.

Уласныя відэаролікі з самарэкламаю выкарыстоўвалі кандыдаты Дзмітрый Кучук і Аляксандра-Вольга Тыгрыцкая. Прома-ролік Кучука быў размешчаны на афіцыйным сайце Беларускай партыі «Зялёныя» і на канале партыі на відэапартале *youtube.com*; ролік Тыгрыцкай – на адным з каналаў *youtube.com*.

## Асноўныя вынікі даследавання

Вяртаючыся да пачатковага пытання (ці ёсць інтэрнэт прыкладным інструментам у лакальнай палітычнай кампаніі ў Беларусі на прыкладзе сталіцы) можна разгледзець наступныя звесткі: з агульнай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты па Мінску 70 чалавек (31,67% ад агульнай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў) мелі акаўнты на сайце *odnoklassniki.ru*; 47 (21,27%) – на сайце *vkontakte.ru*; 28 (12,66%) – на сайце *facebook.com*; 9 (4,07%) – у блогавай сістэме *twitter.com*; 13 (5,88%) – у блогавай сістэме livejournal.com, *blogspot.com* ды інш.; 5 чалавек (2,26 %) былі ўладальнікаў персанальных сайтаў.

Калі аналізаваць узроставую структуру, то можна заўважыць, што найстарэйшую мае рэсурс odnoklassniki.ru – 32,23 года; сярэдні ўзрост кандыдатаў, што маюць уласныя сайты, – 31,4 года; сярэдні ўзрост кандыдатаў, што маюць рэгістрацыю ў блогавых сістэмах «LiveJournal», «Blogspot» ды інш. – 31,31 года; далей ідуць зарэгістраваныя карыстальнікі сайту *facebook.com* – 30,03 года; *vkontakte.ru* – 26,57 года; сістэмы *twitter.com* – 26,4 года.

Калі ў адносінах да кандыдатаў да 30 гадоў уключна карыстацца катэгорыяй «моладзь», то паводле ўзроставых звестак даследавання можна зрабіць выснову, што інтэрнэт у мэтах выбарчай кампаніі выкарыстоўвалі пераважна маладыя людзі (гл. табл. 7).

Калі праводзіць параўнанне ў выкарыстанні вэб-рэсурсаў паводле палітычнай прыналежнасці, то маем наступную сітуацыю (гл. табл. 8).

Відавочна, што па ўсіх інтэрнэт-рэсурсах большасць актыўных карыстальнікаў прыпадае на групы апазіцыйных кандыдатаў і кандыдатаў без вызначанай арганізацыйнай прывязанасці. Пры гэтым апошняя група мае лідарства на трох рэсурсах: на сайце *odnoklassniki.ru*, блогавых сістэмах (акрамя сістэмы *twitter.com*) і персанальных сайтах. Група апазіцыйных кандыдатаў мае першыя пазіцыі таксама ў трох рэсурсах: *vkontakte.ru*, *facebook.com* і абсалютны стоадсоткавы паказчык ў мікраблогу *twitter.com*. Група праўладных

**Табліца 7. Узрост кандыдатаў у дэпутаты, якія выкарыстоўвалі інтэрнэт у выбарчай кампаніі**

| Назва рэсурсу | Сярэдні ўзрост карыстальнікаў з наяўнасцю вэб-актыўнасці, гадоў | Узроставая структура карыстальнікаў да 30 гадоў уключна, % | Узроставая структура карыстальнікаў ад 31 года, % |
|---|---|---|---|
| odnoklassniki.ru | 32,06 | 56,25 | 43,75 |
| vkontakte.ru | 28,75 | 62,5 | 37,5 |
| facebook.com | 32 | 50 | 50 |
| twitter.com | 30 | 50 | 50 |

**Табліца 8. Размеркаванне паводле палітычнай прыналежнасці кандыдатаў у дэпутаты, якія выкарыстоўвалі інтэрнэт у выбарчай кампаніі**

| Назва рэсурсу | Колькасць праўладных кандыдатаў, % | Колькасць апазіцыйных кандыдатаў, % | Колькасць кандыдатаў без вызначанай арганізацыйнай прывязанасці, % |
|---|---|---|---|
| odnoklassniki.ru | 25 | 25 | 50 |
| vkontakte.ru | 12,5 | 62,5 | 25 |
| facebook.com | 0 | 66,67 | 33,33 |
| twitter.com | 0 | 100 | 0 |
| іншыя блогавыя сістэмы | 22,22 | 33,33 | 44,44 |
| персанальныя сайты | 0 | 20 | 80 |

кандыдатаў мае пэўныя пазіцыі сярод карыстальнікаў сайту odnoklassniki.ru (чвэрць) і крыху больш за 20% сярод тых кандыдатаў, што маюць уласныя блогі. Пры гэтым праўладная група ніяк не рэпрэзентаваная на сайце *facebook.com* і ў блогавай сістэме *twitter.com*, а таксама не ўключае ніводнага ўладальніка персанальнага сайту.

У Табліцах 9, 10 і 11 (гл. Дадатак) прыводзіцца інфармацыя пра стан вэб-актыўнасці. Бачна, што рэсурс *odnoklassniki.ru* эфектыўней выкарыстоўвалі кандыдаты Эдуард Кузняцоў (праўладны) і Юрый Меляшкевіч (апазіцыйны кандыдат). Рэсурс *vkontakte.ru* найлепш выкарыстоўвалі Аляксандр Лагвінец, Фёдар Масленнікаў і Аляксандр Сяргеенка (усе апазіцыйныя); *facebook.com* – Вадзім Канапацкі і Аляксандр Лагвінец (апазіцыйныя); *twitter.com* – Аляксандр Лагвінец і Фёдар Масленнікаў (апазіцыйныя).

Сярод уладальнікаў персанальных блогаў найбольш удалае і практычнае выкарыстанне можна было назіраць у Міхаіла Радкевіча (кандыдат без арганізацыйнай прывязанасці), Аляксандра Лагвінца (апазіцыйны), Ірыны Пташнік (без арганізацыйнай прывязанасці), Таццяны Куўшынавай (без арганізацыйнай прывязанасці) і Юрыя Меляшкевіча (апазіцыйны). Сярод уладальнікаў персанальных

сайтаў – у Аляксандра Лагвінца (апазіцыйны) і Таццяны Куўшынавай (без арганізацыйнай прывязанасці).

Калі разглядаць якасныя паказчыкі комплексна, то зноў можна зрабіць выснову, што эфектыўнасць выкарыстання інтэрнэту была большаю сярод групы апазіцыйных кандыдатаў – 11 выпадкаў (адзін на сайце *odnoklassniki.ru*; тры – на сайце *vkontakte.ru*; па два – на рэсурсах *facebook.com* і *twitter.com*; два – у блогавых сістэмах і адзін – сярод уладальнікаў персанальных сайтаў). Пры гэтым на сайтах *vkontakte.ru*, *facebook.com* і *twitter.com* прадстаўнікі апазіцыі мелі найлепшую арганізацыю вэб-актыўнасці. Сярод прадстаўнікоў групы кандыдатаў без арганізацыйнай прывязанасці тры асобы эфектыўна выкарыстоўвалі інтэрнэт-рэсурсы ў блогавых сістэмах; адзін кандыдат эфектыўна выкарыстоўваў персанальны сайт. Сярод праўладных кандыдатаў толькі адзін – сябра Ліберальна-дэмакратычнай партыі Эдуард Кузняцоў – эфектыўна выкарыстоўваў вэб-рэсурс для выбарчай кампаніі (сайт *odnoklassniki.ru*).

Сярод кандыдатаў, абраных у дэпутаты, вэб-актыўнасць назіралася толькі ў Вадзіма Кудзіна і Ігара Шылава (абодва мелі ўласныя блогі), але узровень вэб-актыўнасці на гэтых рэсурсах быў слабы, з чаго можна зрабіць выснову, што праўладныя кандыдаты выкарыстоўвалі інтэрнэт-рэсурсы ва ўласных кампаніях вельмі неэфектыўна. Лідарства ў актыўнасці належала групе апазіцыйных кандыдатаў, але гэтую выснову нельга лічыць цалкам аптымістычнаю, бо нават сярод гэтай групы бальшыня кандыдатаў ўвогуле не мела рэгістрацыі ў сацыяльных сетках ці блогавых сістэмах, не кажучы ўжо пра наяўнасць сайтаў. Лідарства кандыдатаў ад апазіцыі на некаторых рэсурсах можна патлумачыць тым, што апазіцыя ўжо дзесяцігоддзе застаецца пазасістэмнаю, і кандыдаты, якія не маюць доступу да дзяржаўных традыцыйных і электронных медыяў, выкарыстоўвалі магчымасць данясення ўласнай пазіцыі хаця б праз інтэрнэт.

Агулам, па выніках даследавання, можна зрабіць выснову, што нават у сталіцы ў абсалютнай большасці выпадкаў інтэрнэт не выкарыстоўваўся кандыдатамі пры правядзенні кампаніі ды, такім чынам, не зрабіўся прыкладным інструментам падчас сёлетніх мясцовых выбараў.

**Літаратура**


1. «Alexa – Top sites in Belarus» (2010), URL (consulted 01.08.2010) http://www.alexa.com/topsites/countries/BY
2. «Belarus Facebook Statistics» (2010), URL (consulted 10.10.2010) http://www.facebakers.com/countries-with-facebook/BY/
3. *The World Factbook. Belarus. Communications* (2008), URL (consulted 04.07.2010) https://www.cia.gov/library/publications/the-world-factbook/geos/bo.html
4. «"Белтелеком" готовится к расширению интернет-шлюза» (2010), URL (доступ 30.09.2010) http://it.tut.by/202082
5. «ЖЖ читают более 270 тысяч белорусов» (2010), URL (доступ 14.07.2010) http://www.electroname.com/story/6824
